*Няхай жыве Ленінскі камсамол—верны памочнік і рэзерв Камуністычнай партыі!*

*Юнакі і дзяўчаты! Настойліва вучыцеся працаваць і жыць па-камуністычнаму!*

*Няхай жыве слаўная савецкая моладзь!*

(З Заклікаў ЦК КПСС да 46-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі).

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 31 (540) Субота, 26 кастрычніка 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы




Учора адна з аўдыторый гуманітарнага корпуса сустракала маладых, дапытлівых, цікаўных.

У чым мэта і сэнс нашага жыцця?

У чым вы бачыце ўжо сёння рысы камунізма?

Ці гатовы вы жыць пры камунізме і кіраваць яго справамі?

Як вы ўяўляеце сабе ўсебакова развітую асобу пры камунізме?

Як жыць і працаваць, каб духоўная прыгажосць чалавека праявілася паўней і ярчэй?

Якія маральныя якасці больш за ўсё неабходны будаўнікам камунізма?

Як стаць сёння ўровень з эпохай?

Ці трэба марыць аб будучыні?

У чым прыгажосць і высакароднасць чалавека?

Чаму мы сурова асуджаем эгаістаў, дармаедаў, скнараў, стыляг, бюракратаў як апошняе прыстанішча чужой нам ідэалогіі і маралі?

Гэтыя пытанні закранулі душу кожнага юнака, кожнай дзяўчыны, што прыйшлі на дыспут-вечар, арганізаваны дыскусійным клубам Мінскага гарадскога аддзялення таварыства «Веды» і камітэтам камсамола Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна — «Ведаць, шукаць, змагацца».

Матэрыялы аб дыспуце чытайце ў наступным нумары газеты.

## Каб студэнты заўсёды былі ўдзячны

Быў позні час, калі мы пастукалі ў дзверы. Нам адчынілі не адразу. І гэта зразумела: працоўны дзень буфета ў інтэрнаце № 2 закончыўся. Але ў чарзе было чалавек дзесяць. Буфетчыца Анна Малчанава спакойна звярталася да студэнтаў, прапануючы (хоць і невялікі) выбар страў. Студэнты ў асноўным пагаджаліся з прапановамі буфетчыцы. Адлічвалі манеты, уважліва сачылі за вагавой стрэлкай, садзіліся за стол. Проста, як і ў любым іншым буфеце.

Але нас цікавіла іншае. У размове з многімі студэнтамі выявілася, што Анна Іванаўна працуе тут два гады і працуе добра. Вельмі ветлівая, тактычная. Ніхто з прысутных не мог назваць выпадку абважвання ці абліку ў грошах. Але нехта са студэнтаў выказаў аднойчы думку, што калі б не было ў буфетчыцы даходу, яна б тут не працавала. З дазволу студэнтаў, мы некалькі порцый страў тут жа ўзважылі. Вага аказалася дакладнай. Саромецца прыйшлося тым, хто выказаў крыўдную для работнікаў буфета думку.

Але недахопы ў рабоце буфета ўсё ж ёсць.

— Трэба звярнуць увагу на тое, што звычайна бывае ў буфеце. Возьмем, напрыклад, кампот. Яго завозяць у буфет ад выпадку да выпадку. А гэты ж прадукт ніяк нельга назваць дэфіцытным.

— І напіткі рэдка бываюць, — пачуліся галасы.

— Калі, нарэшце, на сталах будзе гарчыца? Каўбасы прывозяць і недарагія, а гарчыцу забываюць! Няўжо сапраўды яе нельга нідзе дастаць?

І тут жа, у час праверкі, у шафе мы знайшлі гарчычніцы і некалькі кілаграмаў гарчыцы ў парашку.

— Спецыяльна захоўваем для мыцця посуду, — растлумачвала буфетчыца.

Правільна. Посуд павінен быць чысты. І гэта так і ёсць у буфеце. Студэнты заўсёды ўдзячны за працалюбства пасудамойкі Ольгі Паўлаўны Досінай. А няўжо так цяжка прыгатаваць гарчыцу для некалькіх столікаў?

Здавалася б, што чысціня ў падсобных памяшканнях павінна быць выключная. Ніхто, акрамя работнікаў буфета, там не бывае. Аднойчы навёў парадак — і падтрымлівай яго пастаянна.

Нам давялося агледзець шафу для захоўвання хлебапрадуктаў. Усе паліцы засцелены чыстай кляёнкай. На іх — хлеб. Але ён раскідан па ўсіх кутках. І буфетчыца ў апраўданне занятасцю прынялася тут жа ўкладваць хлеб.

На адной з паліц мы прыпаднялі кляёнку, раздзвінулі дошкі. Аказваецца, буфетчыца з пяцігадовым стажам і падазраваць не магла, што на дошках можа з'явіцца сіняя-сіняя плесень. Прыйшлося растлумачваць, што многія студэнты ў арміі бывалі і за адчыкамі складаў, і хлебарэзамі, але яны ніколі не дапускалі з'яўлення плесені на паліцах. Сушылі паліцы, змазвалі іх алеем, скраблі нажамі. Гэтыя ж прадукты прыходзіцца і самім есці.

І ужо недаравальна побач з прадуктамі трымаць скрынкі з бітымі бутэлькамі, шклянкамі. Ніхто не гарантаваны, што кавалачкі шкла не трапяць у бачкі з баршчом, бульбай. Спрэчкі няма: усе недахопы можна і трэба ліквідаваць. Праверкі і камісіі праводзяцца рэдка, а працуе буфет штодзень. І тыя добрыя водгукі, што пішуць студэнты ў адрас буфетчыцы, павінны заўсёды поўнасцю адпавядаць праўдзе.

**У рэйдзе ўдзельнічалі:**

**Мікалай Аляшкевіч**, студэнт 5 курса фізічнага факультэта, старшыня прафкома факультэта;

**Анна Ігнаценка**, студэнтка 3 курса фізічнага факультэта, член студсавета;

**Таццяна Дземчанка**, студэнтка 4 курса фізфака, старшая дзяжурная па інтэрнаце;

**Мікалай Карэба**, студэнт 4 курса фізфака, член прафбюро факультэта;

**Людміла Аніканава**, студэнтка 3 курса вяч. аддз. журналістыкі.

*Пісьмо з Крыма*

## Рэктару Белдзяржуніверсітэта

Група Вашых студэнтаў хімічнага факультэта ў саставе 19-ці чалавек: Арван, Бондар, Васілеўская, Зіневіч, Нікалаенкава, Пяркоўская, Тумаш, Пракопчс, Шкаруба, Крысько, Дзенскевіч, Сіткевіч, Дубаневіч, Кулінская, Чарвякова, Фядотка, Шапавалава, Лахвіч, Мяцельскі — працавала на працягу месяца ў 5-м аддзяленні вінсаўгаса «Судак». Выконваючы разнастайныя работы на тытуню і нарыхтоўцы пажыўнага асяроддзя, студэнты праявілі выключную добрасумленнасць і працалюбства. Штодзённа выконвалі вытворчыя планы з высокай якасцю. У непрацоўны час паводзілі сябе вельмі сціпла, не дапускаючы і малейшых учынкаў, якія маглі б скампраметаваць годнасць савецкага маладога чалавека і тым больш званне студэнта вышэйшай навучальнай установы.

Адміністрацыя саўгаса і 5-га аддзялення вельмі ўдзячныя студэнтам за іх працу, арганізаванасць і дысцыплінаванасць.

З павагай

упраўляючы 5-га аддзялення вінсаўгаса «Судак» вінкамбіната «Масандра» Е. М. ЛАЗАРАЎ.

У гуртках палітасветы

## Навучальны год пачаўся арганізавана

Чэрвенскі Пленум ЦК КПСС вызначыў задачы па камуністычнаму выхаванню, прадыктаваныя новым этапам у развіцці нашага грамадства. Рашэнні Пленума надаюць мэтанакіраванасць усёй ідэалагічнай рабоце партыі, у тым ліку і палітычнай асвеце мас.

У мінулым годзе ва ўсіх гуртках, арганізаваных для работнікаў адмгаспчасткі, вялікае месца заняло вывучэнне матэрыялаў лістападаўскага Пленума ЦК КПСС, даклада М. С. Хрушчова на Пленуме, а таксама іншых важнейшых партыйных дакументаў.

Новы навучальны год у сетцы партыйнай асветы ў нас пачаўся арганізавана. Для павышэння ідэйна- палітычнага ўзроўню работнікаў было створана 13 гурткоў. З іх 11 гурткоў па вывучэнню бягучай палітыкі, гурток па вывучэнню гісторыі КПСС, семінар «Эканоміка краін сацыялізма».

Для правядзення заняткаў партыйны камітэт універсітэта выдзеліў вопытных прапагандыстаў. Асноўнай задачай у гэтым навучальным годзе з'яўляецца далейшае павышэнне зместу палітычнай вучобы, павышэнне яе ідэйна-палітычнага ўзроўню, узмацненне сувязі з жыццём, з рашэннем канкрэтных задач, пастаўленых перад універсітэтам, падняцце працоўнай дысцыпліны.

**В. П. АНАНЬКА,**
**член партыйнага бюро АГЧ.**



Студэнты-выпускнікі хімічнага факультэта праходзяць вытворчую практыку на розных прадпрыемствах горада. Веды, атрыманыя ў аўдыторыях, праходзяць праверку жыццём. Пяцікурснікі яшчэ раз агледжваюць свае мінулыя студэнцкія гады: ці ўсё яны бяруць з сабой у жыццёвы шлях, ці хопіць ім ведаў?

На здымку: студэнткі 5 курса хімфака Святлана Слышкіна і Людміла Танклеўская на вытворчай практыцы на мінскім заводзе медпрэпаратаў.

Фота Яўгена КАРПІНЧЫКА.

# Фоторэпартаж

# Мінск. Парк „Перамога“. 20 кастрычніка

У нядзелю ў парку «Перамога» адбыўся масавы крос студэнтаў універсітэта, прысвечаны XIII з'езду прафсаюзаў. Наш фотакарэспандэнт Яўген Карпінчык расказвае аб гэтай буйнейшай падзеі ў спартыўным жыцці універсітэта з дапамогай свайго надзейнага сябры — фотааб'ектыва.

Тэкст Яўгена Ляхава.



Здымак 1. Перш чым прабегчы дыстанцыю, трэба прайсці некаторыя «бюракратычныя перашкоды»: адзначыцца ў судзейскай калегіі, запоўніць лісток удзельніка кроса.



Здымак 2. Стартуюць гісторыкі.



Здымак 3. Мікалай Шлег, пераможца кроса, на дыстанцы.



Здымак 4. Перад стартам. Вось, дзе псіхолагу было б работы! Паглядзіце, як праводзяць апошнія хвіліны перад выхадам на дыстанцыю ўдзельнікі кроса. Адны абсалютна спакойныя, другія — зусім наадварот — нярвова мітусяцца ў месцы збору.



Здымак 5. Абмяркоўваюць спартыўныя падзеі мінулай нядзелі студэнты фізфака У. Новікаў і Д. Саковіч, дэкан факультэта І. П. Зяцькоў, загадчык кафедры фізвыхавання В. П. Шапялевіч.



Здымак 4. Кожнаму спартсмену хочацца як мага раней уведаць свой вынік на дыстанцыі. І ля століка судзейскай калегіі заўсёды хто-небудзь стаіць, зазіраючы праз плечы ў судзейскі пратакол.

# Крос у лічбах і фактах

* * *

**У кросе ўдзельнічала 1540 студэнтаў.**

* * *

З 1540 удзельнікаў кросу разрадныя нарматывы выканалі усяго 76 чалавек.

* * *

**Пераможцам сярод мужчын на дыстанцыі 1000 метраў стаў студэнт першага курса гістфака Мікалай Шлег. Яго час — 2,52,7.**

* * *

**Пераможцай сярод жанчын на дыстанцыі 500 метраў стала Раіса Мельнік, студэнтка трэцяга курса геафака. Яе час — 1.34,0.**

* * *

Месцы ў агульнакамандным заліку размеркаваліся так:

гістарычны, геаграфічны, матэматычны, філалагічны, юрыдычны, біялагічны, хімічны, фізічны факультэты. Пры размеркаванні агульнакамандных месц карэнным чынам улічвалася масавасць.

**Жанна Ляхава.**

## Увага!

***Заўтра ў парку „Перамога“ адбудзецца фінал асенняга лёгкаатлетычнага кроса.***

**Першы старт—у 11 гадзін.**

## Кніжная паліца

**Бібліятэка БДУ паведамляе чытачам аб новых кнігах, атрыманых у апошні час:**

МИТИН М. Б. **В. И. Ленин о непримиримости коммунистической и буржуазной идеологий.** М., «Знание».

ОВАНДЕР Н. Э. **О роли идей марксизма-ленинизма в борьбе за победу социалистической революции в России.** Киев, изд. КГУ.

**КПСС и строительство коммунизма.** К 60-летию II съезда РСДРП. (Сборник статей). Казань, изд. КазГУ.

МИРКИНА И. З. и др. **Крушение колониализма.** Краткий справочник. М., Госполитиздат.

**СССР и страны Африки.** 1946—1962 гг. Документы и материалы. В 2 т. М., Госполитиздат.

**Арабские страны.** История. (Сборник статей). М., изд. вост. лит.

ИЛЛЕРИЦКИЙ В. Е. **История России в освещении революционеров-демократов.** М., Соцэкгиз.

КАМЕНЦЕВА Е. И. и УСТЮГОВ Н. В. **Русская сфрагистика и геральдика.** (Уч. пособие для вузов). М., «Высшая школа».

**Очерки истории коллективизации сельского хозяйства в союзных республиках.** Сборник статей. М., Госполитиздат.

АСМУС В. Ф. **Проблема интуиции в философии и математике.** (Очерк истории: XVII — начало XX в.). М., Соцэкгиз.

КЕДРОВ Б. М. **Единство диалектики, логики и теории познания.** М., Госполитиздат.

**Мораль, как её понимают коммунисты.** (Документы, письма, высказывания К. Маркса, Ф. Энгельса, В. И. Ленина, Ф. Э. Дзержинского, М. И. Калинина, Н. К. Крупской, Н. С. Хрущева). 2-е, доп. изд. М., Госполитиздат.

ДРОБНИЦКИЙ О. Г. **Оправдание безнравственности.** Критические очерки о современной буржуазной этике. М., Госполитиздат.

ТИХОНОВ И. А. **Материально-техническая база коммунизма и производительность труда.** М., Соцэкгиз.

**Вопросы славянской филологии.** Сборник статей. Саратов, изд. СГУ.

**Славянское языкознание.** М., изд. АН СССР.

ЧУКОВСКИЙ К. И. **Живой, как жизнь.** О русском языке. (Изд. 2-е, переработ.). М., «Молодая гвардия».

ГУС М. С. **Литература и эпоха.** Лит. критич. статьи. М., «Советский писатель».

**Материалы по математической лингвистике и машинному переводу.** (Сборник статей). Л., Изд. ЛГУ.

ПИРСОН Х. **Диккенс.** Пер. с английского. М., «Молодая гвардия».

**Славянские литературы.** М., изд. АН СССР.

ОВСЯННИКОВ М. Ф. и СМИРНОВА З. В. **Очерки истории эстетических учений.** М., изд. Академии художеств СССР.

**Заўвага:** усе пералічаныя кнігі выдання 1963 года.

**ОТВЕТ НА ЗАДАЧУ, ОПУБЛИКОВАННУЮ В № 30.**

Смоленск, Дрогобыч, Свислочь, Мелекесс, Черновцы, Кокчетав, Москва.

**Рэдактар У. КУЛАЖАНКА**

**Адрас рэдакцыі:**
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 10533. Тыр. 2000. Зак. 3852.